# Што такое адзінства?

Робец Ксенія, вучаніца XI класа, дзяржаўная ўстанова адукацыі "Сярэдняя школа № 8 г.Слоніма"

Дзень народнага адзінства, які з 2021 года адзначаецца 17 верасня, – гэта адно з самых значных свят у нашай краіне. Прымеркавана свята да пачатку вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь у 1939 годзе. Менавіта тады знікла мяжа паміж Заходняй і Усходняй часткамі Беларусі, краіна стала адзіным цэлым, набыла тэрытарыяльнае і народнае адзінства.

А што такое адзінства з пазіцыі сённяшняга дня і майго разумення?

Пачнём з дзяцінства. Адзінства для дзіцяці, перш за ўсё, – гэта сям'я. Гэта жаданне быць разам з тымі, хто яго любіць, абараняе і падтрымлівае. І няма для дзіцяці розніцы, хто па нацыянальнасці мама ці тата. У радаводе нашай сям'і ёсць беларусы і рускія. І мы любім і шануем адзін аднаго, клапоцімся і падтрымліваем адзін аднаго. А ўсе мы адна сям'я, мы звязаны сямейным адзінствам.

І пачуццё адзінства з Радзімаю, я так думаю, пачынаецца ў дзяцінстве, з нашага захаплення тым, што мы бачым навакол, чаму цешымся, чаму радуемся. А менавіта яно, дзіцячае ўспрыманне рэчаіснасці і наваколля, грае велізарную ролю ў станаўленні чалавека як асобы. Любоў да радзімы, яна адтуль, з маленства, і адзінства з радзімаю таксама з маленства.

Пра любоў да радзімы не абысціся адным абзацам, бо яна і мая, і наша агульная Беларусь! Бо яна блакітная і зялёная, чыстая і светлая! Тых, хто ўпершыню прыязджае ў нашу краіну, больш за ўсё ўражвае незвычайная чысціня і прыгажосць вакол, гасціннасць і ветлівасць жыхароў. Ды і я ніколі не стамляюся захапляцца ёю! Толькі ўявіце сабе: высокае неба, блакітнае-блакітнае, карункавыя аблокі, лёгкія-лёгкія, і ты, расклаўшы рукі, ляжыш на траве пад мірным небам, дыхаеш чыстым паветрам і радуешся сонейку, заслухоўваешся спевамі птушак. Якое шчасце!

Мая Радзіма! Радзіма беларуса! Мірная радзіма! Я тут нарадзілася, тут жывуць мае сябры, мае родныя і блізкія. З ёю я непарыўна звязана, і яна, Радзіма, для мяне адзіная, як маці! І мы з маёю Радзімаю адзіны!

Агульнавядома, што галоўнае багацце любой краіны – гэта яе людзі. Безумоўна, славіцца наша Радзіма сваім руплівым, працавітым і міралюбівым народам, а калі трэба, то мужным, рашучым і адважным. Гістарычна склалася, што Беларусь аб'яднала ў адзінае людзей розных нацыянальнасцей і веравызнання, якія шчасліва жывуць тут, любяць гэтую зямлю, ганарацца ёй. І як важна, што, незалежна ад нацыі, рэлігіі, традыцый і звычаяў грамадзяне нашай краіны жывуць і працуюць як адзіная вялікая і дружная сям'я.

Беларусаў аб’ядноўвае пачуццё гонару за сваю краіну, за яе слаўную гісторыю. Старонкі далёкага мінулага прымусілі мяне задумацца над пытаннямі жыццёвага подзвігу, мужнасці самых простых людзей, якія адстойвалі незалежнасць нашай краіны. Лічу, што сапраўднае адзінства праявілі беларусы побач з байцамі іншых нацыянальнасцей у гады Вялікай Айчыннай вайны! Ніхто не сумняваецца, што дзякуючы патрыятызму, дзякуючы згуртаванасці і яднанню, удалося не проста выстаяць у барацьбе з фашызмам, але і перамагчы! І як важна пра гэта памятаць, не забываць горкія ўрокі мінулага.

17 верасня – Дзень народнага адзінства – вучыць нас, беларусаў, быць уважлівымі да сваёй гісторыі, знаходзіць у мінулым адказы на актуальныя пытанні сучаснасці і сумесна будаваць сваю будучыню.

Перад вачыма адзін з яркіх прыкладаў адзінства – мітынг у горадзе Слоніме, прысвечаны святкаванню Дня народнага адзінства. На плошчу горада прыйшлі як кіраўнікі раёна, так і прадстаўнікі працоўных калектываў і арганізацый, ветэраны. Жыхары выйшлі на мітынг з адзіным лозунгам: і на плакатах, і ў сэрцы гучала “Мы разам, мы адзіныя!” Сланімчане з вялікай любоўю да Беларусі і гонарам за яе актыўна прымаюць удзел у штогадовай акцыі – аўтапрабег і велапрабег “За адзіную Беларусь”, якія ладзяцца да Дня народнага адзінства (з гонарам адзначу, што мой тата таксама прымае ў іх удзел). Не забываюць арганізатары і пра тое, што трэба аб’ядноўваць моладзь. Сучасныя моладзевыя аб’яднанні пранізаны духам адзінства. У прыватнасці, не забуду пахваліць арганізатараў за задуму зрабіць акцэнт на віртуальнай прасторы для розных моладзевых віктарын, напрыклад, той жа віктарыны “Сіла ў адзінстве“, што ладзіцца да Дня народнага адзінства. Моладзь жа, ды і я не выключэнне, шмат часу праводзіць у сацыяльных сетках, таму вельмі правільны падыход.

Адзінства праяўляецца не толькі ў вялікіх гістарычных падзеях, але і ў штодзённым жыцці кожнага з нас. Сям’я, сябры, аднакласнікі – гэтыя мікрагрупы будуюцца на прынцыпах даверу, узаемаразумення і падтрымкі. Калі людзі аб’яднаны адной справай, будуюць агульныя планы, працуюць разам, то яны могуць дасягаць куды больш значных і важкіх вынікаў, чым паасобку. Сумесныя захапленні, такія як спорт, мастацтва і музыка, ствараюць пачуццёвае адзінства. Фестываль “Славянскі базар” у Віцебску аб’ядноўвае сэрцы аматараў прыгожага. Гэта пацвярджае той факт, што мы не толькі суперажываем адзін аднаму, але і радуемся перамогам, весялімся разам.

З пазіцыі свайго ўзросту скажу: як важна разумець, што менавіта ад нас, маладых, залежыць будучыня нашай краіны, мы ў адказе за яе. Хто як не мы павінны абараняць і памнажаць тое, што стваралася дзясяткамі гадоў?! Дакладна ўсведамляю, што моладзь – гэта будучыня нашай краіны. Наша задача – захаваць незалежную і суверэнную Беларусь. У адзінстве сіла і моц беларускага народа – гэта наш нацыянальны код, які адрознівае нас ад іншых. Так спрадвеку было і так будзе заўсёды!